***Краязнаўчы каляндар на 2024 год складзены на аснове звестак з энцыклапедычных выданняў і зборнікаў:***

- Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн., 1996-2004;

- Рэспубліка Беларусь: энцыкл : в 6 т. – Мінск: БелЭн., 2005-2008;

- Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн.,1993-2003;

- Культура Беларусі: энцыкл.: у 6 т. – Мінск: БелЭн., 2010-2015;

- Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX стст: энцыкл. давед. – Мінск: БелЭн., 1995;

- Гродненщина в лицах: [биографический справочник / составители: Ю. И. Косицкий, Л. В. Мальцева, М. А. Комарова; редколлегия: В. В. Кравцов и др.]. - Минск: Белтаможсервис, 2018. - 245 с.

- Пяткевіч А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / Аляксей Пяткевіч.- Гродна, 2000;

- Культура Гродзеншчыны: Факты. Падзеі. Асобы . – Мінск, 2014;

- Ермоленко Е. А. 400 имён: жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины / В. А. Ермоленко, В. Н. Черепица. – Гродно, 2014;

- Лауреаты премии имени А. И. Дубко "За творческие достижения в области культуры и искусства" / [И. И. Аникевич и др.; составители: Е. В. Климович, Л. Ч.

Новицкая; редакционный совет: В. А. Лискович (председатель) и др.]. - Гродно: Гродненская типография, 2018. - 267 с.

- Памяць: Шчучынскі раён. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 590 с.

- Данскіх, С. Стагоддзі і падзеі Шчучынскай зямлі / Сяргей Данскіх . – Баранавічы: Баранов. укруп. тип., 2007. – 252 с.

- Щучинский район: фотоальбом. – Гродно: ГОУПП” Гродненская типография”, 2015. – С. 43.

У календары ўказваюцца сувязі дзеячоў з Шчучыншчынай, змешчаны звесткі аб **43** юбілеях прадстаўнікоў розных галін дзейнасці, прадпрыемстваў, арганізацый, ўстаноў.

## У 2024 годзе спаўняецца:



**500** гадоў з часу пабудовы **Маламажэйкаўскай царквы-крэпасці** (в. Мураванка) (1524 г.)



**370** год з дня нараджэння **Шчукі Станіслава** (1654—1710), публіцыста, грамадскага дзеяча.

**265** гадоў з дня нараджэння **Серафімовіча Фердынанда** (1759 – 1812), педагога, асветніка, выкладчыка рыторыкі і этыкі ў Шчучынскай піярскай школе.

**250** год з дня нараджэння **Чарнецкага Эдуарда** (1774, Шчучын —5.3.1831), педагога. Вывучаў ў Берліне педагогіку і філасофію. Выдаў працу “Прынцыпы адукацыі паводле Нямейера” з дадаткам “Пра якасці настаўніка і падрыхтоўцы да настаўніцкага стану”.

**155** год з дня нараджэння **Кашуцкай Людвікі** (псеўд. Лясота, дзявоч. Ягалкоўская, 1869, в. Поплава Шчучынскага раёна – 27. 10. 1928) , пісьменніцы, педагога.

**115** гадоў з дня нараджэння **Станкевіч Зінаіды** (1909 – 1988), беларускага грамадскага дзеяча, педагога, магістра батанікі. Настаўнічала ў Шчучыне і Навагрудку.



**95 гадоў** з дня нараджэння **Мірона Уладзіміравіча Мардуховіча (**нар. у 1929 г., г.п. Жалудок – 2015, Ліпецк, Расія), архітэктара, заслужанага будаўніка Расіі (1996).



**90** гадоў з дня нараджэння **Кузьміцкага Яна** (нар. у 1934 г., в. Багданаўцы - ?), жывапісца і скульптара. Займаецца разьбой па дрэве. У цэнтры яго твораў заўжды чалавек, з усімі сваімі пачуццямі, надзеямі, сумненнямі і перажываннямі. У 1957 г. выехаў за мяжу.

**85** гадоў з часу заснавання **Шчучынскага лясгаса** (1939).

**80** гадоў з часу заснавання **Астрынскай гарпасялковай бібліятэкі** (1944).

**80** гадоў з часу заснавання **аддзела культуры і вольнага часу «Астрынскі Дом культуры і тэатральнай творчасці»** (1944).

**70** гадоў з часу заснавання **інтэгрыраванай бібліятэкі аг. Дэмбрава** (1954).

**70** гадоў з часу заснавання **Навадворскай сельскай бібліятэкі** (1954).



**70** гадоў з дня нараджэння **Багдзевіча Станіслава Уладзіміравіча** (нар. 1954 г. у в. Бакшты), старшыня Усеваложскага спажывецкага таварыства. Дэпутат сходу прадстаўнікоў муніцыпальнага ўтварэння "Усеваложскі раён Ленінградскай вобласці". Заслужаны работнік гандлю РФ. Узнагароджаны знакам "За добрасумленную працу ў спажывецкай каапераціі Расіі", ганаровай граматай

губернатара Ленінградскай вобласці. Узнагароджаны ордэнам "За ўклад у развіццё спажывецкай кааперацыі Расіі". Ганаровы грамадзянін Усеволожска і Усеволожскага раёна Ленінградскай вобласці.

**65** гадоў таму **доследная станцыя** з Бенякон пераведзена ў г. Шчучын (1959).




**65** гадоў з дня адкрыцця **Аўтамабільнага парка № 12** (1959).

**60** гадоў з часу заснавання Жалудоцкага аддзялення "Сельгастэхніка" (1964), Цяпер **ААТ "ШчучынАГРАХІМсэрвіс".**

**55** гадоў з пачатку дзейнасці **ААТ “Шчучынскі масласырзавод”** (1969).



**55** гадоў з часу ўвядзення ў строй новага **лячэбнага корпусу раённай бальніцы** (1969).

**45** гадоў з часу заснавання **аддзела культуры і вольнага часу «Ракавіцкі Дом культуры» (1979).**



**35** гадоў з часу аднаўлення набажэстваў ў **Шчучынскім касцёле Святой Тэрэзы** (1989).

**15** гадоў з часу заснавання **ДУА «Васілішкаўская школа мастацтваў» (2009).**

## Студзень



**1 – 75** гадоў з дня нараджэння **Ягорычава Уладзіміра Яўгенавіча** (нар. у 1949 г., в. Красляне), беларускага гісторыка, педагога, публіцыста, пісьменніка. З 1974 г. працуе ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы.

**1** – 70 гадоў з дня нараджэння **Раўкуця Юзаса (Юзафа)** Антонавіча (нар. У 1954 г., г. Шчучын), артыста балета, заслужанага артыста Беларусі.

## Люты



**16 – 85** гадоў з дня нараджэння **Немена Чэслава** (сапр. Выджыцкі Чэслаў Юліуш; 1939, в. Старыя Васілішкі – 2004), польскага спевака, кампазітара, аранжыроўшчыка, рок-музыканта.

*Вучыўся ў Гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчы (1954—1958), у музычнай школе ў Гданьску. З 1962 года – саліст групы «Небеска-Чарні», заснавальнік і вакаліст груп «Акварэле»,*

*«Немен Энігматык», «Немен», «Немен Аэраліт». З 1980-х г. выступаў сольна. Першы выканаўца польскай папулярнай музыкі. Валодаў моцным нізкім голасам шырокага дыяпазону, для яго характэрна экспрэсіўная манера выканання. Аўтар і выканаўца музыкі і песень да спектакляў, кінафільмаў, т.л. «Гульня» Е.Каваляровіча, «Выйшаў у ясны,пагодны дзень» К.Вайцяхоўскага, «Вяселле» А.Вайды. Запісаў шмат альбомаў з групамі і асобна. Лаўрэат міжнародных фестываляў эстраднай песні ў г. Аполе (1967), Сопат (1979).*

## Сакавік



**23 – 125 гадоў з дня нараджэння Галіны Вольгі Уладзіміраўны** (сцэнічны псеўданім: дзявочае Грудзінская, па мужу Александроўская). (нар. у 1899 г., г.п. Жалудок – 4.12.1980), актрысы, педагога, народнай актрысы Беларусі.

*Актрыса вялікай сцэнічнай культуры. Створаныя ёю вобразы вызначаліся інтэлектуальнасцю, багаццем і шматграннасцю сцэнічных характарыстык: Ганна, Графіня Стрэмбоўская («Машэка», «Кастусь Каліноўскі» Е.Міровіча), Яворская, Альдона («Мост», «Вір» Я.Рамановіча), Пані Яндрыхоўская, Марозава, Прымановіч («Партызаны», «Пяюць жаваранкі», «Людзі і д'яблы» К.Крапівы), Купавіна («Ваўкі і авечкі» А.Астроўскага), Соф'я («Апошнія» М.Горкага), Ранеўская, Аркадзіна («Вішнёвы сад», «Чайка» А.Чэхава), Карэніна («Жывы труп» Л.Талстога), Тэадора («Дурная для іншых, разумная для сябе» Лопэ дэ Вэгі). Выступала ў перыядычным друку з успамінамі пра дзеячаў беларускага тэатра, з рэцэнзіямі на спектаклі, артыкуламі-роздумамі пра сутнасць акцёрскага мастацтва. Узнагароджана 2 ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1948, 1955) і ордэнам «Знак Пашаны».*

## Красавік



**2 – 85 гадоў з дня нараджэння Ваўчка Уладзіміра Іванавіча** (нар. у 1939 г., в. Красляне, Дэмбраўскі с/с - 2012), трэнера (вольная барацьба). Працаваў у Лідзе з 1967 г. трэнерам у таварыстве "Спартак", "Чырвоны сцяг", у ДСШ, майстра спорту СССР па вольнай барацьбе (1964), суддзі рэспубліканскай катэгорыі (1973), заслужанага трэнера Беларусі (1993).

**1 – 70** гадоў з дня нараджэння **Болтач Ніны Віктараўны** (нар. у 1949 г.), заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь, працавала ў сярэдняй школе № 2 г. Шчучына.



**14 – 80** гадоў з дня нараджэння **Максімовіча Вячаслава Аляксандравіча** (нар. у 1944 г., в. Пяскі Шчучынскага раёна), беларускага спартыўнага педагога, трэнера (барацьба грэка-рымская), майстра спорту СССР, заслужанага трэнера Беларусі і СССР.

## Май



**11 – 80** гадоў з дня нараджэння **Шаўчонак Марыі Сіланцьеўны** (нар. у 1944 г., в. Новы Востраў Клічаўскага раёна.), беларускай паэтэсы, журналіста, перакладчыка, лаўрэата прэміі імя А. І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама “За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва” у намінацыі “Пісьменнік года”(2005). З 1965 г. настаўнічала ў Ракавіцкай сярэдняй школе Шчучынскага раёна. У 1966—1978 гг.

працавала ў шчучынскай раённай газеце «Савецкая вёска».



**26 – 70** гадоў з дня нараджэння **Бяляўскай Галіны Прохараўны** (нар. у 1954 годзе ў вёсцы Азярцо Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці) педагога, мастака, паэткі, лаўрэата прэміі імя А.І. Дубко Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва»

## Чэрвень



**9 – 75** гадоў з дня нараджэння **Дарашкевіча Віктара Іванавіча** (нар. у 1949 г., в. Цёмнае Балота Шчучынскага р-на - 2003), беларускага літаратуразнаўца, культуролага, крытыка, перакладчыка, тэкстолага. Кандыдата філалагічных навук (1977), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994). Сярэднюю школу скончыў у г.п.Астрына.

## Ліпень



**7 – 65** гадоў з дня нараджэння **Лісава Аляксандра Генадзьевіча** (нар. у 1959 г. , г. Шчучын), беларускага гісторыка, мастацтвазнаўца, краязнаўца, педагога.



**12 – 95** гадоў з дня нараджэння **Гічана Антона Уладзіміравіча** (1929 - 1987), работніка сельскай гаспадаркі, Героя Сацыялістычнай Працы (1966). У 1952 – 1972 гг. працаваў брыгадзірам, загадчыкам вытворчага участка калгаса "1 Мая" Шчучынскага раёна. У 1972 – 1976 гг. – загадчык жывёлагадоўчай фермы калгаса "1 Мая" Шчучынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.



**17** – **65** гадоў з дня нараджэння **Русілкі Вольгі Іванаўны (**нар. у 1959 в. Бершты, Шчучынскага раёна), беларускай паэтэсы, педагога, літаратуразнаўца, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча (2004), Літаратурнай прэміі імя П. Броўкі, выдатніка адукацыі Беларусі.

**жнівень**



**8 – 65** гадоў з дня нараджэння **Адамовіч Тэрэзы Антонаўны** (нар. у 1959 г., в. Танявічы Шчучынскага раёна), беларускага фалькларыста. З 1986 г. – мастацкі кіраўнік Жытамлянскага народнага тэатра народнай песні "Матуліна песня".

## Верасень



**14 – 95** гадоў з дня нараджэння **Шоты Альфрэда Тадэўшавіча (**1929 - 2021**),** заслужанага будаўніка Беларусі. З 1960 г. працаваў у ПМК – 26 “Гроднааблсельбуда”, дзе прайшоў шлях ад рабочага да начальніка ПМК, ганаровага грамадзяніна г.Шчучына (2007 г.).



**16 – 65** гадоў з дня нараджэння **Мухляды Віктара Казіміравіча** (нар. у 1959 г., в. Кронькі Шчучынскага раёна), беларускага трэнера (міні - футбол), заслужанага трэнера Беларусі.




**20 - 80 год** з часу ўваходу **Шчучынскага раёна** ў склад Гродзенскай вобласці (20.09.1944 год)

## Кастрычнік



**1 – 95** гадоў з дня нараджэння **Місюка Казіміра Пятровіча** (нар. у 1929 г., в. Лагады Шчучынскага раёна - 1992), работніка сельскай гаспадаркі, механізатара, Героя Сацыялістычнай Працы (1976). Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна.



**23 – 100 гадоў з дня нараджэння Лепешава Івана Якаўлевіча** ( нар. у 1924 г., в. Іскозы, Дубровенскі раён — 12 кастрычніка 2014) — беларускага мовазнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара.

*З 1956 года настаўнічаў у Берштаўскай сярэдняй школе, дзе стварыў літаратурна-краязнаўчы гурток. Удзельнікі яго разам са сваім педагогам сабралі нямала цікавых звестак з гісторыі Берштаў, запісвалі мясцовы фальклор. Работа гэтага гуртка была абагульнена ў кнізе «Літаратурна-краязнаўчы гурток (з вопыту)», што выйшла ў 1969 г. Пазней І. Лепешаў выступіў з артыкулам «З лексікі вёскі Берштаў Шчучынскага раёна».*

**Снежань**



**2 - 145** гадоў з дня нараджэння **Стацкевіча Фелікса Іванавіча** (нар. у 1879 г., г. Шчучын – 21.06.1967), беларускага грамадскага і культурнага дзеяча, педагога, выдаўца. Склаў "Эсперанта-беларускі слоўнік".



**23 – 60** год з дня нараджэння **Абдулаевай Святланы Іосіфаўны** (нар. у 1964 г. в. Ашмянцы Шчучынскага раёна) , беларускай паэткі.